Выкладчык вачыма студэнта

# ПЕРШ ЗА ЎСЁ – АБАВЯЗАК

**Адносіны студэнтаў-філолагаў да Уладзіміра Пятровіча Каваленкі, дацэнта кафедры беларускай літаратуры, які выкладае беларускую літаратуру XX стагоддзя, неадназначныя і супярэчлівыя. Адны пераказваюць сваім сябрам і першакурснікам жарты педагога, іншыя не памятаюць сябе ад страху напярэдадні экзаменаў або залікаў, якія ён прымае. Некалькі штрыхоў да асобы Уладзіміра Пятровіча паспрабавала дадаць аўтар гэтай публікацыі.**

**– Уладзімір Пятровіч, мужчына-філолаг – гэта выпадковасць або нейкая заканамернасць?**

– Гэта выпадак, як і любое здарэнне ў жыцці. Магчыма, я ацэньваю сябе крыху самаўпэўнена, аднак думаю, што і ў іншых прафесіях я не быў бы... апошнім.

**– Як вы лічыце, чым кіруюцца тыя хлопцы, якія паступаюць сёння на філалагічны факультэт?**

– Сярод юнакоў, якія скончылі універсітэт (хоць іх няшмат), ёсць вядомыя пісьменнікі – паэты, празаікі. Драматургаў, праўда, няма. Не ведаю, якімі матывамі яны кіруюцца. Магчыма, у армію не хочуць ісці. Або выпадковасць нейкая, магчыма. А вамі, дзяўчаты, якія памкненні рухаюць?

**– Мне асабіста філалогія падабаецца. А для вас асабіста філалогія – гэта...**

– Філалогія – гэта абавязак, служба. Калі ж узнёсла адказаць, то сярод вас, маладых, і я сябе не адчуваю старым.

**– Скажыце, а з якой даследчай працай вы прыйшлі ў навуку?**

– Я быў яшчэ аспірантам, і першая мая навуковая работа была прысвечана рэгіянальным асаблівасцям беларускай літаратуры. Праходзіла рэспубліканская канферэнцыя, на якой я выступіў з артыкулам «Рэгіянальныя асаблівасці ў творчасці І.П. Шамякіна».



*На здымку: У.П. Каваленка разам са студэнтамі філфака на радзіме пісьменніка Івана Мележа.*

**– Ці часта вы ставілі студэнтам экзамен ці залік «аўтаматам»?**

– Аднойчы я выставіў так усёй групе, адразу – усім.

**– Чым жа яны так вылучыліся сярод астатніх?**

– Не, у дадзеным выпадку справа была ў ва мне.

**– Напэўна, вы былі ў такім добрым настроі?**

– Не трэба разумець так спрошчана. У той час я збіраўся звальняцца з працы. Гэта былі семінарскія заняткі, на якіх студэнты актыўна выступалі з дакладамі, і я проста вырашыў пазбавіць іх лішніх праблем.

**– Уладзімір Пятровіч, узгадайце, калі ласка, самы яркі і запамінальны момант з вашага дзяцінства.**

– Самы першы ўспамін, як я сябе памятаю, – гэта я сяджу на школьным ганку. Бацькі мае жылі ў школе і пайшлі ў той час некуды па неадкладных справах, а мяне пакінулі, сказаўшы, каб я з ганку не сыходзіў. І я роўненька цэлы дзень сядзеў, хаця дзеці клікалі мяне гуляць.

**– У якой ступені, на ваш погляд, поспехі дзяцей залежаць ад бацькоў?**

– У самай вялікай. Існуе памылковае меркаванне, што выхоўваць павінна школа. У першую чаргу яна дае веды. Так заўсёды было, хаця і Закон Божы выкладалі да рэвалюцыі, і нейкія ідэалагічныя прадметы ў савецкі час. Асноўная задача школы – даць веды і нейкія прафесійныя навыкі. А што датычыцца выхавання, то ні ў царскія часы, ні цяпер, ні ў будучым настаўнікі дрэннаму не вучылі і вучыць не стануць.

**– На нашым факультэце ў асноўным жаночы калектыў – і выкладчыкі, і студэнткі. А якой, на ваш погляд, павінна быць прыгожая жанчына, дзяўчына. Вы за стандартныя 90 – 60 – 90?**

– Думаю, што нейкае асабістае ўспрыняцце жаночай прыгажосці павінна быць (ды яно і ёсць). Сам я прытрымліваюся такога тэзісу: прыгожае тое, што маладое. Хаця лічаць, што ёсць свая прыгажосць і ў старасці...

**Гутарыла**
**Таццяна БАНДАРЧУК,**
**студэнтка гр. БФЖ-42 філфака.**

Официально

# ВМЕСТО ПРОПИСКИ – РЕГИСТРАЦИЯ

**В Беларуси упраздняется институт прописки. Соответствующая норма содержится в Указе № 413 "О совершенствовании системы учета граждан по месту жительства и месту пребывания", который подписал Президент Беларуси.**

Как пояснили БЕЛТА в пресс-службе главы государства, согласно указу в целях обеспечения необходимых условий для реализации гражданами своих прав на свободу передвижения и выбор места жительства, предусмотренный статьей 30 Конституции Беларуси, с 1 января 2008 года:

упраздняется институт прописки, отличающийся множественностью правовых актов на уровне актов Совета Министров СССР, Министерства внутренних дел, местных исполнительных и распорядительных органов;

вводится единый на всей территории нашей страны порядок регистрации граждан Республики Беларусь, а также иностранных граждан и лиц без гражданства, постоянно проживающих в Республике Беларусь, по месту жительства и месту пребывания;

права и обязанности, возникшие у гражданина в связи с постоянной или временной пропиской, сохраняются, перерегистрация по месту жительства или месту пребывания не предусматривается;

регистрация по месту жительства (постоянного) является обязанностью граждан, а регистрация по месту пребывания (временного) – правом (за исключением граждан, прибывших из другого населенного пункта для обучения в учреждениях образования, научных организациях, которые обязаны зарегистрироваться на срок обучения).

Цікавыя сустрэчы

# У гасцях – «ЛІМаўцы»

На філалагічным факультэце прайшла сустрэча студэнтаў з супрацоўнікамі газеты «Літаратура і мастацтва» Алесем Карлюкевічам і Ірынай Шаўляковай-Барзенка. Госці распавядалі не толькі пра выданне, у якім яны працуюць, але і часопісы «Маладосць», «Полымя», «Всемирная литература». Гаворка ішла пра іх змест,а таксама новыя творчыя задумы літаратараў, якія павінны выклікаць цікавасць у чытачоў гэтых перыядычных выданняў.

Па словах Алеся Карлюкевіча, адметны праект будзе ажыццяўляцца старэйшым часопісам рэспублікі «Полымя», сутнасць якога заключаецца ва ўзбагачэнні, пашырэнні тэматыкі дзіцячай літаратуры. У часопісе будуць друкавацца рэцэнзіі не толькі літаратурна-крытычнага зместу, але і мовазнаўчага накірунку.

Парадуе навінкамі і часопіс «Маладосць», на старонках якога плануецца друкаваць творы, прысвечаныя літаратурным мясцінам Беларусі. Кожная вёсачка, кожнае мястэчка будзе прадстаўлена сваімі таленавітымі пісьменнікамі-землякамі, якія праславілі свой родны кут непаўторнымі мастацкімі творамі.

Сустрэча атрымалася вельмі змястоўнай, карыснай і цікавай не толькі для будучых літаратурных работнікаў. Газета «ЛІМ» чака свежых допісаў новых аўтара сярод якіх павінны быць і студэнты філалагічнага факультэта ГДУ.

**Дар'я ПЯШКУН,**
**студэнтка групы БФЖ-33 філфака**

Веселый перерыв

## ДНЕВНИК СТУДЕНТА

**Понедельник: есть хочется.**
**Вторник: есть хочется.**
**Среда: есть хочется.**
**Четверг: стипендия.**
**Пятница: не помню.**
**Суббота: есть хочется...**

***



На лекции по психологии профессор объясняет студентам, что существуют три степени раздражения:

– Первая: берешь телефон, звонишь по любому номеру и спрашиваешь: "А Васю можно?". Вам натянуто отвечают: "Здесь такой не живет". Вторая степень: набираешь тот же номер телефона и говоришь: "Попросите, пожалуйста, Васю". Вам нервно отвечают: "Нет здесь никакого Васи, вы ошиблись!". Третья степень: набираешь этот же номер и спрашиваешь: "А Вася уже пришел?". На вас кричат: "Да какой, к черту, Вася?". Всем понятно?



Один студент поднимает руку:

– Профессор, я знаю четвертую степень раздражения. Это когда после всего, что вы описали, набираешь тот же номер телефона и говоришь: "Здравствуйте, я Вася. Мне никто не звонил?".



## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад на 5-гадовы тэрмін па кафедрах:**

- тэорыі і практыкі англійскай мовы – выкладчыка (2);
- тэорыі і гісторыі дзяржавы і права – асістэнта;
- ВМ і праграміравання – асістэнта;
- алгебры і геаметрыі – прафесара;
- эканамічных тэорый – дацэнта;
- геаграфіі – старшага выкладчыка;
- радыёфізікі і электронікі – старшага выкладчыка;
- агульнай фізікі – старшага выкладчыка, асістэнта;
- securitatea батанікі і фізіялогіі раслін – старшага выкладчыка;
- фізічнага выхавання і спорту – выкладчыка.

**Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

**Заявы накіроўваць на адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.**

**РЭКТАРАТ**

**Афиша выходного дня**

**200 билетов в кукольный театр на спектакль «Я – цыпленок, ты цыпленок» закуплены профкомом сотрудников нашего университета. Дети в возрасте с 4 до 9 лет с мамами и папами могут интересно провести выходной день, 21 октября, посетив это зрелищное и интересное представление.**

**Начало спектакля в 13.00.**



*Где же ты, рыбка золотая?..*
*Фото В. ЧИСТИКА*

За здоровый образ жизни

# РАССЛАБИТЬСЯ, РАСКРЕПОСТИТЬСЯ?.. (МИНИ-ОПРОС)

**На сегодняшний день проблема алкоголизма в обществе не становится, к сожалению, менее актуальной. Не столь уж редкое это явление и в молодежной среде, что ставит под угрозу демографическую безопасность нашей страны.**

Мы провели мини-опрос на эту тему среди 50 студентов различных факультетов нашего университета, и вот что выяснилось.

Большинство молодых людей (28 человек) выпивают в компании друзей, знакомых для расслабления, раскрепощения. Пятеро отметили, что именно алкоголь помогает им в общении с друзьями, иногда даже способствует новым знакомствам. Девять студентов употребляют спиртные напитки только по праздникам, к которым, кстати, относят и сдачу зачетов, экзаменов, защиту курсовой работы и многое другое. Двое молодых людей признались, что они по-настоящему наслаждаются вкусом спиртного, им нравится сам процесс распития алкоголя, а четверо отметили, что выпивают из-за трудностей, проблем, чтобы забыться. И только двое студентов признались, что употребляют спиртные напитки только в том случае, если появилось такое желание.

Насколько часто молодежь употребляет алкогольные напитки? Большинство опрошенных (26 человек) сказали, что «расслабляются» таким образом только в выходные дни. Десять человек отметили, что выпивают практически каждый день, а одиннадцать студентов употребляют спиртное примерно раз в месяц. И лишь трое из опрошенных пьют алкоголь всего несколько раз в год.

Какие же алкогольные напитки являются наиболее популярными среди молодежи? Большинство студентов (37 человек) считают, что это пиво. Девять опрошенных употребляют крепкие спиртные напитки, двое являются ценителями вина.

**Опрос провела**
**Ольга ТРОФИМЕНКО,**
**студентка гр. БФЖ-42 филфака.**



## Іерогліфы: ад чарапашых панцыраў да камп'ютэраў

У Паляўнічым дамку, што размяшчаецца у самым цэнтры нашага горада, адбылося адкрыццё выставы па гісторыі развіцця кітайскай пісьменнасці. Ініцыятарам выставы з'яўляецца пасольства Кітая ў Рэспубліцы Беларусь. На цырымоніі яе адкрыцця прысутнічалі студэнты з Кітая, якія вучацца ў нашым універсітэце.

Выстава паслядоўна паказвае ўвесь складаны гістарычны шлях кітайскай пісьменнасці ад старажытных часоў да нашых дзён, эвалюцыю іерогліфаў ад напісання на панцырах чарапах да сучаснай кітайскай мовы. Цікава, што самымі галоўнымі носьбітамі пісьменства ў старажытным Кітаі з'яўляліся бамбукавыя і драўляныя дошчачкі. Увазе прысутных былі прапанаваны таксама старажытнакітайскія пячаткі і адбіткі з каменных стэл з нанесенымі на кожнай з іх каліграфічнымі подпісамі.

Сустрэча праходзіла ў вельмі цікавай форме. У ходзе размовы студэнтка нашага універсітэта, якая прыехала да нас з Кітая, зрабіла некалькі ўзораў іерогліфаў, і нават напісала ўсім жадаючым іх імёны на сваёй роднай мове. У зале гучала музыка кітайскіх кампазітараў, што дапамагала прысутным, няхай і на кароткі час, апынуцца ў сапраўдным Кітаі, адчуць яго непаўторную прыгажосць. Вельмі ўразіла слухачоў песня на роднай мове ў выкананні замежных студэнтаў.

Напрыканцы сустрэчы нашаму універсітэту былі ўручаны памятныя падарункі, якія будуць захоўвацца ў цэнтры кітаязнаўства.

Ад імя ўсіх прысутных з вялікай падзякай выступіў загадчык кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства нашага універсітэта У. І. Коваль.

Выстава гісторыі кітайскай пісьменнасці, мяркую, нікога не пакіне раўнадушным, але наведаць яе трэба як мага хутчэй, бо працягнецца яна толькі да пачатку лістапада.

**Алена ПАЎЛАВА,**
**студэнтка гр. БЖ- 33 філфака.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных дадзеных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася дадзеных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — УА «Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны».

Наш адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 60-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.
Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на ОАО «Полеспечать», г.Гомель,ул.Советская,1.
Ответственность за качество печати несет ОАО «Полеспечать».
Качество печати соответствует качеству оригиналов заказчика.

РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4435.
Падпісана да друку 2 кастрычніка ў 11.30.